Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
10 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 109 (28219) Кошт 2100 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Паштовы сэрвіс для ўсіх і кожнага**

СТАР. 3



**Пра мастацтва з Міхаілам Равуцкім**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# ЦУДЫ ТЭХНІКІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**На выставе «Белагра-2016», якая працуе гэтымі днямі ў межах Беларускага агtxрапрамысловага тыдня, ёсць што паглядзець і дарослым, і дзецям. Напрыклад, экспазіцыі ўзораў тэхнікі, якія прадставілі вядучыя айчынныя вытворцы. На пляцоўцы МТЗ, напрыклад, можна ўбачыць і найноўшыя магутныя трактары, і МТЗ-5, які даўно стаў музейным экспанатам, а таксама паспрабаваць сябе ў ролі трактарыста.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Стабільная Беларусь — донар рэгіянальнай бяспекі. Для нас як ніколі актуальнымі з'яўляюцца калектыўныя метады вырашэння міжнародных праблем, заснаваныя на вяршэнстве міжнароднага права, Статута ААН і павазе выбранага шляху развіцця. У сучаснай палітыцы як ніколі актуальна ўменне чуць і разумець адзін аднаго. Большасць крызісаў, сведкамі якіх мы сёння з'яўляемся, у многім узніклі і працягваюць узнікаць з-за дэфіцыту даверу, адмовы ад дыялогу, нядольнасці або нежадання зразумець іншы бок».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19 680,00 | ▼ |
| Еўра | 22 388,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 308,27 | ▲ |
| Укр. грыўня | 790,60 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Прыватызацыя жылля



## Незалежная ацэнка — за свой кошт

**А змяненне тэрмінаў прыватызацыі насельніцтвам жылля дзяржаўнага фонду не плануецца**

**Першага ліпеня ў нашай краіне заканчваецца тэрмін прыёму заяў на прыватызацыю жылых памяшканняў. А вось пасля гэтай даты непрыватызаваныя кватэры будуць пераведзены ў разрад жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання. Колькі ў Беларусі засталося непрыватызаванага жылля? Як вызначаецца яго кошт? Хто мае льготы пры прыватызацыі жылых памяшканняў? На гэтыя і іншыя пытанні на анлайн-канферэнцыі сайта БЕЛТА адказвалі прадстаўнікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі.**

### Ускочыць у апошні вагон

Паводле інфармацыі намесніка **міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзя ТРУБІЛЫ**, па стане на 1 чэрвеня ў краіне застаецца 179 868 жылых памяшканняў, якія прадастаўлены людзям па дагаворах найму жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду і якія падлягаюць прыватызацыі. З улікам рашэнняў, што яшчэ прымаюцца аб прыватызацыі, колькасць такіх памяшканняў можа скласці каля 163 тысяч. Такім чынам, прыкладна 93% існуючага жыллёвага фонду знаходзіцца ва ўласнасці грамадзян.

Магчыма, большасць карыстальнікаў непрыватызаванага жылля пачнуць больш актыўна варушыцца менавіта ў апошнія тыдні чэрвеня. Таму Мінжылкамунгас і распрацаваў план мерапрыемстваў, звязаных з завяршэннем працэдуры прыватызацыі дзяржаўнага жыллёвага фонду. У адпаведнасці з ім арганізацыі абавязаны забяспечыць прыём дакументаў у будныя і выхадныя дні да 20.00, а ў апошнія дні месяца, з 27 па 30 чэрвеня ўключна, — з 6.00 да 24.00.

СТАР. 4

■ Абітурыент-2016

## СІСТЭМА БЕЗ «УЦЕЧКІ»,

або Прыёмная кампанія — справа дзяржаўнай важнасці

**«Сістэма цэнтралізаванага тэсціравання страхуе падчас правядзення ў краіне экзаменацыйнай кампаніі ад любых карупцыйных праяў», — такую думку выказала на пасяджэнні Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах старшыня дзяржкамісіі, намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Я неаднойчы наведвала Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, дзе дэталёва вывучала ўсе этапы арганізацыйнай працы па правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання, знаёмілася, як адбываецца фарміраванне тэстаў, дастаўка экзаменацыйных матэрыялаў і праверка работ, і таму ўпэўнена, што тут не можа быць ніякай уцечкі інфармацыі, ніякага ўмяшання звонку, — падкрэсліла Наталля Качанава.

СТАР. 3

# УДЗЕЛ У НОВЫМ СТАТУСЕ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка плануе прыняць удзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) у Ташкенце 24 чэрвеня.**

Гэта будзе першы саміт міжнароднай арганізацыі, у якім Беларусь прыме ўдзел на вышэйшым узроўні ў новым статусе назіральніка, расказаў у інтэрв'ю расійскаму інфармацыйнаму агенцтву «ТАСС» міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей, паведамляе БЕЛТА. «Улічваючы сур'ёзную зацікаўленасць Беларусі ў актывізацыі супрацоўніцтва з ШАС, а таксама высокі ўзровень прадстаўніцтва замежных дэлегацый на мерапрыемстве, нашу краіну будзе прадстаўляць Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка», — заявіў міністр.

Ён адзначыў, што на ўсіх апошніх самітах краіны — члены ШАС паслядоўна выступаюць за больш шырокае прыцягненне дзяржаў-назіральнікаў да практычнага супрацоўніцтва ў арганізацыі. «Мы таксама ставім перад сабой задачу па ўдзеле ў рэгулярных кансультацыях і павышэнні практычнай аддачы ад нашага ўзаемадзеяння ў розных галінах. Што датычыцца двухбаковых сустрэч, хачу адзначыць, што ў нас дастаткова плыцовак і падстаў для кантактаў з нашымі партнёрамі па СНД. Таму перш за ўсё прапрацоўваем сустрэчы з нашымі важнымі азіяцкімі партнёрамі», — сказаў Уладзімір Макей.

# ЗА АСАБІСТЫ ЎКЛАД У ДРУЖБУ

**Вядомыя дзеячы Дзяржаўнай Думы Федэральнага сходу Расіі ўдастоены дзяржаўных узнагарод. Адпаведны ўказ падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

Палітыкі ўзнагароджаны за значны асабісты ўклад ва ўмацаванне дружалюбных адносін і супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй, станаўленне Саюзнай дзяржавы, развіццё эканамічных, навукова-тэхнічных і культурных сувязяў. Ордэна Дружбы народаў удастоены кіраўнік фракцыі Камуністычнай партыі Расіі ў Дзярждуме Генадзь Зюганаў. Першы намеснік старшыні Дзяржаўнай Думы Іван Мельнікаў і старшыня Камітэта Дзяржаўнай Думы па справах Садружнасці Незалежных Дзяржаў, еўразійскай інтэграцыі і сувязях з суайчыннікамі Леанід Слуцкі ўзнагароджаны ордэнам Пашаны.

■ Знешняя палітыка

# НАЗІРАЛЬНІКІ ЗА ПАРЛАМЕНЦКІМІ ВЫБАРАМІ ЗАПРОШАНЫ

## Пра гэта на брыфінгу паведаміў прэс-сакратар МЗС

**Міністэрства замежных спраў накіравала запрашэнні на адрас Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ і Выканаўчага сакратарыята Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Як праінфармаваў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Дзмітрый МІРОНЧЫК, дыпламатычнае ведамства кіравалася ўказам кіраўніка дзяржавы № 190 ад 6 чэрвеня, які вызначыў дату правядзення выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**

— Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ і Выканаўчы сакратарыят СНД — гэта традыцыйныя адрасаты, якіх запрашае Міністэрства замежных спраў, — дадаў прадстаўнік МЗС.

Па яго словах, у найбліжэйшы час Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь накіруе аналагічныя запрашэнні адпаведным парламенцкім структурам.

— Вы ведаеце базавую ўстаноўку беларускага боку, што датычыцца выбараў: мы збіраемся праводзіць іх у поўнай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам, міжнароднымі стандартамі і збіраемся рабіць гэта празрыста, — адзначыў Дзмітрый Мірончык. — Таму я не выключаю ўдзел у назіранні шырокага кола арганізацый, з якімі мы кантактуем, з якімі мы супрацоўнічаем.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by* ■

# ЗВАНІЦЕ, ВАС ПАЧУЮЦЬ

## По традыцыі ў суботу пройдуць прамыя тэлефонныя лініі

**На званкі жыхароў краіны адкажуць кіраўнікі гарадоў, раёнаў і абласцей, разам яны пастараюцца знайсці шляхі выхаду з праблемных сітуацый. Падобная сувязь функцыянуе ўжо больш за год, за гэты час чыноўнікам патэлефанавалі тысячы людзей. Сотні пытанняў былі не толькі пачуты, але і вырашаны.**

Людзей традыцыйна турбуюць праблемы, звязаныя з жыллёва-камунальнай гаспадаркай, сацыяльнымі выплатамі, капітальным рамонтам, добраўпарадкаваннем тэрыторый.

Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць прамыя тэлефонныя лініі і ў гэтую суботу, 11 чэрвеня, свае пытанні можна задаць з 9.00 да 12.00.

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні АСКЕРКА Віктар Вітальевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ДЗЯШКО Уладзімір Іосіфавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васільевіч (80222501869)

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
кіраўнік спраў КОТАЎ Мікалай Аляксандравіч (80172224444).




# ГАЛОЎНАЯ ЖЫТНІЦА КРАІНЫ

## Такую рэпутацыю падтрымлівае Міншчына на працягу апошніх 5 гадоў

**Па выніках пяцігодкі (2011—2015) Мінская вобласць прызнана найлепшай сярод рэгіёнаў і занесена на рэспубліканскую Дошку Гонару.**

Валавы збор збожжа ў сельскагаспадарчых арганізацыях вобласці з 2010 года павялічыўся ў 1,3 раза — амаль на паўмільёна тон. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых культур за пяцігодку склала 38,7 цэнтнера з гектара. У дзяржаўныя засекі штогод паступае больш 2 млн тон збожжа, а гэта 25% ад усяго валавога збору краіны.

— Нямала зроблена па фарміраванні сучаснай інфраструктуры жывёлагадоўчай галіны. За пяць апошніх гадоў пабудаваны 103 новыя, рэканструяваны і пераасначаны 382 малочныя фермы. Тут работы выконваліся пераважна гаспадарчым спосабам, за кошт асабістых сродкаў, а спецыялізаваныя падрадныя арганізацыі прыцягваліся толькі да асобных відаў працаёмкіх работ. Гэта дазволіла істотна скараціць затраты. Кошт будаўніцтва абыходзіўся сельгасарганізацыям у сярэднім у 3-4 млрд рублёў. Дзякуючы новым тэхналогіям павысілася вытворчасць працы, якасць прадукцыі, палепшыліся ўмовы працы, — канстатаваў **старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА** падчас абласнога форуму ўдзельнікаў V Усебеларускага народнага сходу.

Як вынік, за пяцігодку вытворчасць малака павялічылася амаль на 10%. Летась кожны чацвёрты кілаграм атрыманага ў краіне малака паступаў на перапрацоўчыя прадпрыемствы з фермаў і комплексаў Мінскай вобласці. Павялічылася і таварнасць малака: з 85% у 2010-м да 90% у 2015-м. Мінулы год сярэдні надой на карову склаў амаль 5 тыс. кілаграмаў, што вышэй за сярэднерэспубліканскі паказчык на 109 кілаграмаў. Арганізацыямі мяса-малочнай галіны рэалізавана больш як 40 разнастайных праектаў. У выніку сёння сталічная вобласць выпускае дзясяткі відаў новай якаснай прадукцыі. У прыватнасці, Валожынскі раён — беконную свініну, Мядзельскі — сыр з блакітнай цвіллю і пастэрызаванае малако з доўгім тэрмінам захоўвання, Стаўбцоўскі — кактэйлі-прадукты для дзяцей ранняга ўзросту, аналагаў якім няма ў Беларусі, Мінскі малочны завод — канцэнтраваную сыроватку, Маладзечанскі раён — паўцвёрдыя сычужныя сыры, Салігорскі — безлактознае малако і тварог.

У Салігорску ўведзены ў дзеянне завод па вытворчасці гранулёваных складаназмешаных угнаенняў. Гэта пашырыла асартымент запатрабаванай прадукцыі і дазволіла пераарыентаваць рынкі збыту. У Жодзіне выпушчаны самы буйны ў свеце кар'ерны самазвал грузападымальнасцю 450 тон для работы ў складаных умовах надвор'я. За непрацяглы час у Кузбасе ён перавёз звыш 5 млн тон грузаў, што параўнальна з работай на працягу аднаго года цэлай транспартнай арганізацыі. Цяпер на БелАЗе на выпрабаванні яшчэ два такія самазвалы, але з прымяненнем новых прагрэсіўных тэхнічных рашэнняў па шэрагу сістэм і вузлоў.

Большасць удасканаленняў — менавіта беларуская тэхналогіі. У Пухавіцкім раёне бясспрэчным лідарам па выпуску 30 відаў хімічных сродкаў аховы раслін стала закрытае акцыянернае таварыства «Аўгуст-Бел». У Дзяржынскім раёне пабудаваны завод «Штадлер Мінск» і пачата вытворчасць сучасных электрацягнікоў. У Нясвіжскім раёне завершана будаўніцтва завода «Фармлэнд» па выпуску жыццёва неабходных лекавых сродкаў з плазмы крыві чалавека — праект не мае аналагаў у краінах СНД. У Барысаўскім раёне асвоена серыйная зборачная вытворчасць легкавых аўтамабіляў «Джылі».

Як адзначыў Сямён Шапіра, у 2016—2020 гадах патэнцыйнымі пунктамі росту для вобласці павінны стаць такія напрамкі, як біяхімія, фармацэўтыка, вытворчасць медыцынскага абсталявання, тонкая хімія, турызм, аўтамабілебудаванне і электроніка. Напрыклад, у Нясвіжы працягваецца будаўніцтва завода дзіцячага харчавання магутнасцю 500 тон перапрацоўкі малака за суткі. У Слуцку будуецца дражджавы завод. Адной з прыярытэтных задач у развіцці эканамічнага патэнцыялу вобласці Сямён Шапіра лічыць актывізацыю работы па прыцягненні інвестыцый, павышэнні аддачы ўкладзеных сродкаў. Самым значным праектам ён назваў будаўніцтва Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Да канца 2016 года плануецца завяршыць работы па будаўніцтве інжынернай інфраструктуры зоны парка.

— Плануючы работу, мы не павінны рабіць скідкі на цяжкасці. Упэўнены, што ў Мінскай вобласці ёсць усе рэзервы, каб працягнуць паступальнае развіццё і ўнесці свой уклад у павышэнне дабрабыту беларускага народа, — падкрэсліў Сямён Шапіра.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# ГУЛЯЮЦЬ УСЕ!

## У Магілёве ствараюць умовы для будучых зорак па міні-гольфе

**Першыя крокі ўжо зроблены. У маі ў Магілёве адбылося ўрачыстае адкрыццё першай пляцоўкі па міні-гольфе. Як адзначыў падчас гэтага мерапрыемства старшыня Беларускай асацыяцыі гольфа Уладзімір ДРАЖЫН, засталося пабудаваць яшчэ адну і ў абласнога цэнтра будуць усе шанцы на правядзенне чэмпіянату свету па міні-гольфе ў 2019 годзе.**



За апошнія пяць гадоў на Магілёўшчыне шмат чаго зроблена для ўдасканалення матэрыяльнай базы фізкультурна-спартыўнай галіны вобласці. Завершана будаўніцтва лядовай арэны з гульнявой залай і рэканструкцыя гарадскога стадыёна ў Горках. Праведзена рэканструкцыя басейна і спартыўнай залы ў быхаўскім спарткомплексе. Адбыўся капітальны рамонт лыжаролернай трасы і пабудавана пад'язная дарога да яе ў вёсцы Палыкавічы Магілёўскага раёна. У рамках акцыі «Родная старонка — дзецям» пры падтрымцы Беларускай федэрацыі футбола пабудаваны міні-футбольныя палі ў Магілёве, Бабруйску, Быхаве, Касцюковічах і Круглым. У Магілёве другое жыццё атрымалі залы барацьбы дзвюх дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ №3, адна з якіх — алімпійскага рэзерву. Рэканструявана зала цяжкай атлетыкі яшчэ адной магілёўскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы алімпійскага рэзерву «Спартак-2005». Бабруйчане атрымалі ў падарунак аднаўлены стадыён імя Аляксандра Пракапенкі. Сёлета былі ўведзены ў строй басейн у Краснаполлі. Працягваецца будаўніцтва лядовай арэны ў Шклове, фізкультурна-аздараўленчых комплексаў у Касцюковічах і Краснаполлі.

Сёння ў краіне робіцца стаўка на развіццё гольфа і аднаго з яго відаў — міні-гольфа. Гэта пакуль што дастаткова новы для беларусаў, але перспектыўны від спорту. Яго плануюць уключыць у праграму Алімпійскіх гульняў.

Прапанову старшыні Беларускай асацыяцыі гольфа Уладзіміра Дражына па стварэнні ўмоў для гэтай гульні падтрымалі губернатар вобласці Уладзімір Даманеўскі і мэр Магілёва Уладзімір Цумараў. Знамянальна, што на стварэнне пляцоўкі не пайшло ніводнай капейкі з бюджэту. Фінансавую падтрымку аказалі магілёўскія прадпрыемствы новага пакалення VMG Industry і Mebelain. А добраўпарадкаваннем займаліся ў тым ліку і жыхары горада на чале з мясцовым кіраўніцтвам. Гэты аб'ект быў адным з асноўных падчас двух суботнікаў — гарадскога і рэспубліканскага. Вялікую падрыхтоўчую работу правялі камунальныя прадпрыемствы горада. «Магілёўзеленбуд» зрабіў вялікае азеляненне, каб давесці пляцоўку да еўрапейскага ўзроўню. Бо дызайн у гэтым відзе спорту іграе не апошнюю ролю.

— Гольф прызнаны відам спорту, але гэта перш за ўсё прыгожы спосаб арганізацыі вольнага часу, ён выхоўвае лідарскія якасці, дапамагае аднавіць душэўную раўнавагу, — кажа **намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Магілёўскага аблвыканкама Вадзім БРАЖАЗІНСКІ.** — Міні-гольф з'яўляецца папулярнай гульнёй сярод людзей, якія любяць спорт і актыўны адпачынак.

Аб'ект пабудаваны ў сціслыя тэрміны. Знаходзіцца ён за Палацам культуры вобласці побач з гаем, дрэвы якога падчас «Залатога шлягера» высаджвалі «зоркі» эстрады. Да паслуг гульцоў 18 дарожак і павільён для захоўвання інвентара. Настрой ствараюць зялёныя насаджэнні, малыя архітэктурныя формы, прафесійна зробленае асвятленне. Праект быў распрацаваны і ўзгоднены з усімі зацікаўленымі службамі за мінімальны час. Па ацэнцы Уладзіміра Дражына, аб'ект адпавядае міжнародным стандартам. Такі пакуль што адзіны ў краіне. Уладзімір Даманеўскі выказаў спадзяванні, што гэты прыгожы від спорту еўрапейскага ўзроўню прыжывецца як у горадзе на Дняпры, так і ў цэлым па краіне. А мэр горада Уладзімір Цумараў падзяліўся думкай наконт таго, што было б добра да 1 верасня падарыць усім школам камплекты гульні ў міні-гольф. А таксама паабяцаў стаць пастаянным членам гольф-клуба і прывучаць да гэтага віду спорту ўнучак.

Першыя гульні рэспубліканскага ўзроўню адбыліся падчас адкрыцця пляцоўкі. Каб аб'ект запрацаваў у поўную сілу, трэба яшчэ прайсці пэўныя арганізацыйныя моманты. Абслугоўваннем поля для міні-гольфа будзе займацца «Магілёўзеленбуд». Тут высаджаны туі, іншыя экзатычныя расліны, якія трэба дагледзець, — кажуць ва ўпраўленні камунальных прадпрыемстваў, якое з'яўляецца заказчыкам спортпляцоўкі. Само поле для міні-гольфа асаблівага догляду не патрабуе, запэўніваюць спецыялісты. На перыяд зімы яно будзе або дэмантавацца, або надзейна хавацца ад снегу.

Шанц паспрабаваць сябе ў нязвыклым пакуль што для большасці беларускай спорце будзе ў кожнага. Спецыяльных навыкаў для гульні ў міні-гольф не патрабуецца. Правілы ж яе вядзення размешчаны на будынку пракату інвентару. Сэнс у тым, што ўдзельнікі клюшкамі заганяюць мячык у спецыяльныя лункі, спрабуючы прайсці адведзеную дыстанцыю за мінімальную колькасць удараў. Поспех залежыць ад таго, наколькі нязмушана паводзіць сябе ў гульні чалавек. І нават калі ён не стане спартсменам, міні-гольф дапаможа адчуць сябе больш упэўненым і мэтанакіраваным. А гэта сёння вельмі патрэбныя якасці для кожнага чалавека.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# СІСТЭМА БЕЗ «УЦЕЧКІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На пытанне аб тым, ці ёсць неабходнасць усталёўваць пры правядзенні ЦТ металашукальнікі на ўваходзе, а ў памяшканнях — відэакамеры (як гэта робяць у Расіі, каб выключыць спробы скарыстацца на адзіным дзяржаўным экзамене сучаснымі тэхналогіямі), Наталля Качанава дала адмоўны адказ.

— Мне заўсёды шкада маладых людзей, якіх адхіляюць ад удзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, напрыклад за пранесены мабільны тэлефон, але па дарозе да экзаменацыйнай аўдыторыі і ў самой аўдыторыі да пачатку экзамену ўсім абітурыентам неаднаразова нагадваюць пра тое, што тэлефоны трэба здаваць. Таму калі хтосьці ўсе папярэджанні праігнараваў, яго паводзіны нельга назваць няўважлівасцю ці забыўлівасцю. Гэта іх свядомы крок, за які даводзіцца расплачацца, — дадала Наталля Качанава.

Яна звярнула ўвагу на тое, што людзі, уключаныя ў склад дзяржаўнай камісіі, нясуць за сваю працу персанальную адказнасць. Кожны разумее, што робіць справу дзяржаўнай важнасці і ўсведамляе меру сваёй адказнасці. Прыёмная кампанія павінна праходзіць максімальна празрыста. А ў пунктах правядзення цэнтралізаванага тэсціравання не павінны трапляць старонні людзі. Ніводзін дакумент не дае права ўваходу ў будынак, дзе праходзіць ЦТ.

Асноўная функцыя дзяржкамісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных выпрабаванняў заключаецца ў стварэнні роўных умоў для абітурыентаў, абароне інтарэсаў і правоў грамадзян, якія маюць намер паступаць ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Дзякуючы пільнай увазе, якая надаецца ў Беларусі ўступнай кампаніі з боку кіраўніка дзяржавы, на працягу апошніх шасці гадоў пры правядзенні гэтага важнага мерапрыемства карупцыйныя праявы ўвогуле адсутнічаюць.

Па даручэнні Наталлі Качанавай была створана рабочая група для вырашэння ўсіх апеатыўных пытанняў. Яе кіраўніком з'яўляецца начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю бюджэтна-фінансавай сферы Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр Курлыпа.

— Кожны год, калі праводзіцца ўступная кампанія, узнікаюць пэўныя сітуацыі і пытанні, якія проста немагчыма прабачыць, — заўважыла Наталля Качанава. — Напрыклад, летась абітурыентка зламала руку напярэдадні экзамену па творчасці, але ёй далі дазвол на здачу і яна з задачай даволі няблага справілася. Калі можна прыняць рашэнне на карысць абітурыента, то трэба гэта рабіць, безумоўна, не парушаючы ўстаноўленых правілаў. Усё павінна быць у рамках закона.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Па словах віцэ-прэм'ера, у папярэднія гады скаргі і прапановы, якія паступалі ў дзяржкамісію ад абітурыентаў і іх бацькоў, апеатыўна разглядаліся рабочай групай. Між іншым, у бягучым годзе зваротаў у дзяржкамісію пакуль не паступала.

Ва ўсіх установах адукацыі будуць працаваць камісіі па кантролі за ходам уступных выпрабаванняў. Старшынямі гэтых камісій з'яўляюцца члены дзяржкамісіі, а намеснікамі — супрацоўнікі органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю. Пры гэтым кантроль будзе ажыццяўляцца на ўсіх этапах уступнай кампаніі. Цэнтралізаванае тэсціраванне — толькі першы этап. На другім этапе дзяржаўная камісія будзе кантраляваць працэс падачы дакументаў, падрыхтоўкі і правядзення экзаменаў унутры ВНУ і залічэння абітурыентаў у студэнты.

**Міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ** лічыць, што ў Беларусі выпрацавана стабільная сістэма арганізацыі прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Гэта сістэма была створана дзякуючы шматгадовай сумеснай працы дзяржаўнай камісіі, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Міністэрства адукацыі і іншых органаў дзяржаўнага кіравання.

— Пры арганізацыі ўступнай кампаніі 2016 года намі былі выкананы шэраг рэкамендацый, прапанаваных дзяржкамісіяй летась. У тым ліку мы абавязалі кіраўнікоў ВНУ і ССНУ забяспечыць няўхільнае выкананне зацверджаных і даведзеных да грамадскасці кантрольных лічбаў прыёму за кошт сродкаў бюджэту і лічбаў прыёму на платнай аснове, — паведаміў Міхаіл Жураўкоў. — Аб'ёмы, спецыяльнасці, формы атрымання адукацыі не павінны змяняцца пасля іх узгаднення і зацвярджэння, гэта значыць пасля 1 красавіка.

Таксама Міхаіл Жураўкоў падкрэсліў, што рэктары ВНУ сёлета абавязаны ўказаць дакладны алгарытм правядзення конкурсу і залічэння па яго выніках. «З тым, каб пазбегнуць пытанняў, якія ўзнікалі ў абітурыентаў у мінулыя гады», — дадаў ён, напэўна, маючы на ўвазе не зусім карэктную сітуацыю, што склалася ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце летась.

У прадстаўленых на ўзгадненне парадках прыёму ў ВНУ на 2016 год пазначана, ці існуе пры падачы абітурыентам заявы прыярытэтная спецыяльнасць; якую колькасць спецыяльнасцяў абітурыент можа ўказваць у заяве; колькі прадугледжана этапаў правядзення конкурсу і ўмовы ранжыравання абітурыентаў пасля кожнага з этапаў, а таксама іншыя асаблівасці, якія дазваляюць абітурыенту і яго законным прадстаўнікам быць інфармаванымі па гэтым пытанні дакладна і максімальна поўна. Усе парадкі прыёму ў ВНУ даведзены да грамадскасці і размешчаны на сайтах ВНУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**З 1 чэрвеня ў Міністэрстве адукацыі пачала працаваць «гарачая лінія» для абітурыентаў.**

**Дзяжурыць на ёй будуць прадстаўнікі ВНУ, кампетэнтныя ў пытаннях прыёму ў вышэйшыя, сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя ўстановы адукацыі. Практыка запрашэння на «гарачую лінію» спецыялістаў ВНУ выдатна сябе зарэкамендавала: яны не проста тэарэтыкі, а практыкі, якія глыбока і дэталёва разбіраюцца ў любых сітуацыях, а таму могуць пракансультаваць і даць абітурыенту карысную параду.**

**Задаць пытанне па гарадскім нумары (+ 375-17) 222 43 12 можна будзе да 19 жніўня. «Гарачая лінія» працуе з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 18.00.**

**Спецыялісты будуць чакаць званкоў таксама і ў выхадныя дні: па суботах — 18, 25 чэрвеня, 9, 16, 23, 30 ліпеня, 6 і 13 жніўня. І па нядзелях — 19 чэрвеня, 24 ліпеня, 31 ліпеня і 14 жніўня.**

## ■ Надвор'е

# Цяпло ўзяло тайм-аўт

### Сіноптыкі абяцаюць, што лета вернецца толькі ў сярэдзіне наступнага тыдня

**Напрыканцы тыдня на тэрыторыі Беларусі чакаецца даволі халоднае для чэрвеня надвор'е, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

У пятніцу ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 17—23 градусы. А далей нас чакае ўвогуле анамальны холад. У суботу надвор'е істотна пагоршыцца. Да нас завітае моцны цыклон, які будзе перамяшчацца ўздоўж паўночна-заходніх межаў краіны. А ўслед за ім на тэрыторыю Беларусі прыйдуць франтальныя падзелы, якія прынясуць дажджы. Месцамі гэта будуць дажджы з навальніцамі. Удзень дыскамфорту дабавіць яшчэ і парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 7—14 градусаў, а ўдзень тэмпература ў асноўным не будзе вышэйшай за 11—17 цяпла, толькі па паўднёвым усходзе краіны паветра прагрэецца да плюс 20 градусаў.

У нядзелю цыклон перамесціцца на тэрыторыю Расіі, таму ў нас будзе гаспадарыць яго тылавая частка, а на паўднёвым захадзе краіны распаўсюдзіць уплыў зона павышанага атмасфернага ціску. Кароткачасовыя дажджы пройдуць пераважна ў паўночна-ўсходняй частцы Беларусі. Удзень чакаюцца навальніцы, месцамі захаваецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 4-9 градусаў, а ўдзень стане нават крыху цяплей, бо чакаецца плюс 15—21 градус.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## ■ На слыху

# Спартыўны скандал?

### Вядомага футбольнага функцыянера затрымалі па падазрэнні ў атрыманні хабару

Як паведамляе Галоўнае ўпраўленне ўнутраных спраў Мінгарвыканкама, Андрэя Жукава, дырэктара дэпартамента суддзейства і інспектавання Беларускай федэрацыі футбола, затрымалі проста на працоўным месцы. Па гэтым факце ў Маскоўскім РУУС заведзена крымінальная справа. Калі віна будзе даказана, Жукаву пагражае ад трох да пяці гадоў пазбаўлення волі. Затрыманы знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання.

**Якаў ЖУРБІН**

## ■ Добрыя навіны

# ВОСЬ ГЭТА СЭРВІС!




**Жыхары сталічнай Лошыцы ўздыхнулі з палёгкай: днямі ў іх мікрараёне на вуліцы Шпілеўскага, 54 гасцінна расчыніліся дзверы новага аддзялення паштовай сувязі. Падчас яго адкрыцця мы даведаліся, якія паслугі аказвае пошта і што такое паштаматы.**

Лошыца — мікрараён, які актыўна развіваецца. Каля новай пошты — куды ні глянь — новабудоўлі ды вежавыя краны. Асноўная частка насельніцтва — маладыя сем'і, таму нават на адкрыцці аддзялення сувязі было ўражанне, што большасць прысутных — дзеці. Пакуль яны з цікавасцю разглядалі блакітныя (фірменны колер пошты) паветраныя шары, іх бацькі ўважліва слухалі выступоўцаў.

Цяпер у Мінску 119 паштовых аддзяленняў. **Намеснік кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна Андрэй Уладзіміравіч БАНДАРЭНКА** адзначыў, што новае — будзе абслугоўваць амаль 16 тысяч жыхароў, і для Лошыцы дзяжэ пошт пакуль дастаткова. Але ўжо сёння вядуцца пошукі памяшкання для трэцяй, бо пошта і сапраўды — адзін з найважнейшых элементаў інфраструктуры.

...У новабудоўлі, што цалкам лагічна, ёсць новаўвядзенні. У аддзяленні



сувязі №67 для зручнасці кліентаў нават «прастора» ўмоўна падзелена на дзве часткі, у кожную з якіх асобны ўваход: адзін — для прыёму і выдачы паштовых адпраўленняў, другі — для выплат пенсій і дапамог, аплаты камунальных паслуг, афармлення падпіскі на друкаваныя выданні ды іншых аперацый. Спецыяльнае праграмнае забеспячэнне дазваляе фіксаваць месцазнаходжанне кожнага паштовага адпраўлення на стэлажы, што істотна аблягчае яго пошук. Такі спосаб арганізацыі працы аддзяленняў сувязі актыўна ўкараняецца па ўсёй краіне і дапамагае значна паскорыць працэс абслугоўвання кліентаў.

Але ж гэта не значыць, што ім прыйдзецца стаяць у дзвюх чэргах, калі, напрыклад, спатрэбіцца адправіць пасылку і аплаціць за святло. Яны змогуць выканаць абедзве аперацыі ў адным акне: скажам, там, дзе выдаюць пасылкі.

Першыя наведвальнікі прыходзяць якраз па іх. Мужчына з маленькай дачкой усміхаецца: «Пошту адкрылі сёння, а запрашэнне прыйсці сюды, каб атрымаць пасылку, прыйшло яшчэ ўчора. Вось гэта сэрвіс!».

Маладая мама Таццяна прыйшла на адкрыццё з дзіцячым вазком. На яе радасць, уваход у памяшканне дазваляе гэта зрабіць без ніякіх намаганняў. Яна прызнаецца, што пошту наведвае часта: аплаціць паслугі, атрымаць пасылкі з таварамі.

А наогул у новым аддзяленні сувязі гатовы аказаць 64 віды паслуг. Для тых, хто аддае перавагу самаабслугоўванню, устаноўлены плацежна-даведачны тэрмінал. Аднак, як запэўнівае **начальнік вытворчасці «Мінская пошта» РУП «Белпошта» Віктар БУТРЫМ**, электронныя прылады яшчэ не хутка заменяць людзей: «Мы адсочваем запатрабаванасць розных відаў паслуг, і на падставе гэтага ўносім карэктывы. Калі высветліцца, што людзям больш патрэбны так званыя інфакіёскі, мы паставім дадатковыя. Але ж пакуль нашы аператары могуць адказаць кліенту на любыя пытанні, нешта даходліва патлумачыць, чаго машына не зробіць».

Разважанні Віктара Францавіча ахвотна падтрымлівае адна з кліентак: «Я пытаю ў сваёй бабулі: «Чаму ты не карыстаешся інфакіёскам, гэта ж зусім не складана?» А яна мне з усмешкай адказвае: «Ты не разумееш, я хаджу на пошту не толькі для таго, каб аплаціць паслугі... Мне прыемна пагаварыць з чалавекам, паглядзець на іншых людзей».

Тым не менш беларуская пошта прызнана адной з найлепшых у свеце па ўзроўні развіцця электронных паслуг. Тэхналогіі бяруць сваё. У хуткім часе, напрыклад, кліенты пошты змогуць самастойна атрымліваць адпраўленні, ажыццяўляць плацяжы і афармляць падпіску на газеты ды часопісы ў зручных месцах і ў любы час сутак з дапамогай так званых паштаматаў. Яны будуць усталяваны ў месцах, дзе заўсёды многа людзей — на станцыях метро, ля буйных гандлёвых аб'ектаў...

А пакуль у прыярытэце развіцця РУП «Белпошта» — павышэнне хуткасці і якасці абслугоўвання. Ужо досыць даўно створаны аддзяленні сувязі, якія аказваюць паслугі толькі юрыдычным асобам. У планах — адкрыццё ўльтрасучаснага аддзялення з дэманстрацыйнай залай для VIP- і бізнес-кліентаў. На ліпень запланавана адкрыццё вялікага аддзялення сувязі ў сталічным мікрараёне Лебядзіны.

**Дар'я КАСКО**

# Незалежная ацэнка — за свой кошт



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А вось змяненне тэрмінаў прыватызацыі не плануецца. Тут намеснік міністра адзначыў, што прыватызацыя жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду ажыццяўляецца на працягу 24 гадоў і абсалютная большасць наймальнікаў, калі хацелі атрымаць кватэры ва ўласнасць, мелі час гэта зрабіць.

Рашэнне па заяве аб прыватызацыі жылля павінна быць прынята арганізацыяй не пазней чым у месячны тэрмін з даты падачы заявы, а пры заключэнні грамадзянінам дагавора на аказанне паслуг па правядзенні незалежнай ацэнкі рыначнага кошту жылога памяшкання — не пазней як за два месяцы.

Арганізацыя прымае рашэнне аб перадачы жылога памяшкання ва ўласнасць кліента, пацвярджае акт ацэначнага кошту кватэры, рыхтуе да падпісання з уласнікам дагавор на эксплуатацыю жылля з арганізацыяй, якая ажыццяўляе яго эксплуатацыю, а таксама перадае жылое памяшканне пры натарыяльным пасведчанні дагавора куплі-продажу (прыватызацыі). Пасля таго, як арганізацыяй будзе прынята рашэнне аб прыватызацыі кватэры, грамадзянін і члены яго сям'і, якія ўдзельнічаюць у прыватызацыі, павінны звярнуцца ў натарыяльную кантору для засведчання дагавора прыватызацыі ў натарыуса. Пасля гэтага ўласніку трэба прыйсці ў арганізацыю па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці для атрымання тэхнічнага пашпарта на кватэру і рэгістрацыйнага пасведчання на яе.

## Цана прыватызацыі

Кошт аб'ектаў прыватызацыі вызначаецца з улікам іх спажывецкіх якасцяў у цэнах, якія дзейнічаюць на дзень падачы заявы аб прыватызацыі, а таксама іншых дзяржорганаў і арганізацый, вызначаных заканадаўствам, расказвае **намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Вячаслаў АБРАМАЎ**. Для прыватызацыі прымяняецца ацэначны кошт жылых памяшканняў, вызначаны на падставе інфармацыі бухгалтарскага ўліку на першае чысло месяца, у якім пададзена заява аб прыватызацыі. Ацэначны кошт не адлюстроўвае рэальнага кошту жылога памяшкання, што склаўся сёння на рынку нерухомасці, а паказвае прыведзеную да бягучага ўзроўню цэн суму выдаткаў, панесеных на яго стварэнне (набыццё), паменшаную на велічыню назапашанай амартызацыі.

У выпадку нязгоды грамадзяніна з ацэначным коштам, вызначаным у названым парадку, ён мае права да прыняцця рашэння аб прыватызацыі звярнуцца па правядзенне незалежнай ацэнкі рыначнага кошту свайго жылля. Пры гэтым рыначны кошт паказвае камерцыйную цану аб'екта. Пры такой ацэнцы ўлічваюцца асаблівасці і характарыстыкі жылога памяшкання, такія як год пабудовы дома, наяўнасць (адсутнасць) камунікацый, матэрыял сцен дома, фактычны стан жылога памяшкання, геаграфічнае месцазнаходжанне дома і іншыя фактары, якія ўплываюць на яго канчатковую цану. У выніку прыватызацыя жылога памяшкання праводзіцца па найменшым ацэначным альбо рыначным кошце.

## Ацэнка — на выбар

Спадар Абрамаў паведамляе, што незалежную ацэнку сёння паўнамоцныя рабіць усе дзяржаўныя арганізацыі і структуры з доляй дзяржуласнасці ў статутным фондзе больш за 50%, якія ажыццяўляюць ацэначную дзейнасць, а таксама прадпрыемствы, створаныя Беларускай гандлёва-прамысловай палатай ва ўсіх абласцях краіны.

**Арганізацыі абавязаны забяспечыць прыём дакументаў у будныя і выхадныя дні да 20.00, а ў апошнія дні месяца, з 27 па 30 чэрвеня ўключна, — з 6.00 да 24.00.**

Разам з тым трэба ведаць, што незалежная ацэнка рыначнага кошту жылля для прыватызацыі праводзіцца за кошт сродкаў грамадзяніна. Гэтак жа, як і выкананне работ па тэхнічнай інвентарызацыі (праверцы характарыстык) жылога памяшкання і (або) вырабе тэхнічнага пашпарта (ведамасці тэхнічных характарыстык) на яго. У выпадку прыватызацыі жылля па рыначным кошце канчатковая цана прыватызацыі памяншаецца на суму выдаткаў грамадзяніна на аплату гэтай ацэнкі, што пацверджана дакументальна.

## Існуе растэрміноўка на 40 гадоў

Аплата кошту жылых памяшканняў, якія прыватызуюцца, можа рабіцца ў растэрміноўку да сарака гадоў пры ўмове ўнясення першапачатковага ўзносу ў памеры не менш за дзесяць працэнтаў ад агульнай сумы, якая падлягае аплаце. На штомесячныя ўзносы працэнты не налічваюцца. Калі дагаворам куплі-продажу жылога памяшкання, якое прыватызуецца, прадугледжаны адпаведныя ўмовы, тады штомесячныя плацяжы падлягаюць індэксацыі ў выпадку інфляцыі ці дэвальвацыі.

## Ільготы для карыстальнікаў «слабенькага» жылля

Генадзь Трубіла паведамляе, што для грамадзян, якія займаюць жылыя памяшканні ў блакіраваных і аднакватэрных жылых дамах, што маюць не больш за адзін надземны паверх, пры іх зношанасці на 60% і больш існуе права на бязвыплатную перадачу ва ўласнасць такіх памяшканняў, незалежна ад іх агульнай плошчы з улікам цалкам налічанай жыллёвай квоты, сумы квот грамадзян, якія ўдзельнічаюць у прыватызацыі.

Таксама спецыяліст удакладніў, што аб'ектамі прыватызацыі з'яўляюцца жылыя памяшканні, якія прадастаўлены грамадзянам на падставе дагавора найму дзяржаўнага жыллёвага фонду (у тым ліку і індывідуальныя дамы). А вось жылыя дамы (кватэры), якія пабудаваныя грамадзянамі за кошт уласных сродкаў (у тым ліку з прыцягненнем ільготных і іншых крэдытаў), не маюць дачынення да працэдуры прыватызацыі. Жылыя памяшканні, якія належаць на праве ўласнасці грамадзянам і потым былі атрыманыя імі ў спадчыну, прыватызацыі таксама не падлягаюць.

Вычарпальны пералік грамадзян, якія маюць права на льготную прыватызацыю (з улікам жыллёвай квоты, сумы квот), вызначаны артыкулам 140 ЖК. Названым грамадзянам жылыя памяшканні перадаюцца ва ўласнасць бязвыплатна ў межах 20 квадратных метраў агульнай плошчы жылога памяшкання, а таксама па 20 «квадратаў» на кожнага непрацаздольнага непрацуючага члена сям'і, якія пражываюць разам з імі з улікам цалкам налічанай ім жыллёвай квоты, сумы квот.

## З камерцыйнага статусу ў сацыяльны

З першых дзён ліпеня жылыя памяшканні дзяржаўнага жылога фонду, якія не былі прыватызаваныя, пяройдуць у разрад камерцыйнага жылля. Ёсць механізмы, якія дазваляюць частку такіх памяшканняў перавесці ў разрад сацыяльнага жылля. Цікава, а хто зможа скарыстацца гэтым правам?

Генадзь Трубіла кажа, што магчымасць уключэння жылога памяшкання камерцыйнага выкарыстання ў склад жылля сацыяльнага статусу па заяве наймальніка такога памяшкання прадастаўлена толькі асобам, якія маюць права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання. Такое права маюць тыя асобы, што стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, жылыя памяшканні якіх (у тым ліку тыя, якія належаць ім на праве ўласнасці) з-за надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, баявых дзеянняў і тэрарыстычных акцый сталі непрыдатнымі для пражывання.

Да гэтай катэгорыі адносяцца таксама грамадзяне, якія маюць захворванні, і тыя, у складзе сем'яў якіх ёсць дзеці, якія маюць захворванні, названыя ў пераліку, што вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя, пры наяўнасці якіх прызнаецца немагчымым іх сумеснае пражыванне з іншымі асобамі ў адным пакоі або аднапакаёвай кватэры; дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў, у дачыненні да якіх прынята рашэнне аб эмансіпацыі або якія ўступілі ў шлюб; Героі Беларусі, Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, Працоўнай Славы; ветэраны і інваліды Вялікай Айчыннай вайны і інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў; іншыя катэгорыі асоб у адпаведнасці з заканадаўствам. Заяву на ўключэнне жылога памяшкання камерцыйнага выкарыстання ў склад жылых памяшканняў сацыяльнага рангу можна падаць пасля 1 ліпеня. Пры пераводзе жылога памяшкання камерцыйнага выкарыстання ў сацыяльнае жыллё плата за карыстанне такім памяшканнем налічвацца не будзе.

## Без ажыятажу

Спецыялісты Мінжылкамунгаса паведамляюць, што ў Мінску, як найбольш паказальным рэгіёне, пачынаючы са студзеня гэтага года штомесяц прыватызуецца каля 100 кватэр. Пік звароту па пытаннях прыватызацыі і правільнасці налічэння сум прыпаў на 2014 год, калі ўступіў у сілу Указ №563, у якім дакладна былі названы тэрміны заканчэння прыватызацыі. Менавіта тады людзі пачалі актыўна падаваць дакументы ў мясцовыя органы ўлады. У асноўным звароты тычыліся таго, што, на думку грамадзян, быў завышаны кошт прыватызаванага жылля. Напрыклад, у рэгіёнах ёсць жылыя дамы, якія яшчэ ў часы СССР былі пераабсталяваны ў жылыя памяшканні з адміністрацыйных будынкаў. Балансавы кошт кватэр у такіх дамах даволі вялікі і значна перавышае нават рыначную ацэнку. Грамадзяне звярталіся, пасля чаго спецыялісты міністэрства распрацавалі нормы Указа №524, дзе людзям дазволілі прыватызаваць жыллё па меншым кошце, калі ён першапачаткова перавышаў цану аналагічнага жылля на 30% і вышэй.

*Сяргей КУРКАЧ.* *kurkach@zviazda.by*

## Паляўнічыя домікі — праз сеціва

**Папярэдні запіс на арэнду паляўнічых домікаў праз інтэрнэт арганізавала УП «Белдзяржпаляванне».**

Запісацца вельмі проста, расказалі ў Міністэрствелясной гаспадаркі. Трэба зайсці на сайт прадпрыемства, на размешчанай там карце знайсці патрэбны паляўнічы домік. Затым у акне, што адкрыецца, націснуць "запісацца" і выбраць зручную для сябе дату, пасля чаго пакінуць уласныя кантакты і націснуць "забраніраваць".

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


Результаты Рекламной игры

**«ПОКУПАЕМ ПРОДУКТЫ В ОДИН КЛИК»**

**Сведения об организаторе:**
Общество с ограниченной ответственностью «360 медиа групп», далее именуемое «Организатор», адрес: 223051, Минская обл., Минский р-н, п. Колодищи, ул. Минская, дом 5, к. 18. Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 0046451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г.

**Наименование Рекламной игры:**
Рекламная игра носит название «Покупаем продукты в один клик».

**Сроки проведения Рекламной игры:**
Рекламная игра проводится с 25 марта 2016 года по 10 июня 2016 года (включая период розыгрышей и вручения призов).

**Сведения о государственной регистрации Рекламной игры:**
Свидетельство о регистрации Рекламной игры № 2718 от 22 марта 2016 года выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

**Количество участников Рекламной игры:**
Всего к участию в игре было допущено 8 264 участника, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры.

**Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:**
Призовой фонд в размере 82 758 624 (восемьдесят два миллиона семьсот пятьдесят восемь тысяч шестьсот двадцать четыре) белорусских рубля был разыгран полностью.

**Победители по результатам первого розыгрыша от 12 апреля 2016 года:**

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Пименов Андрей Юрьевич | Холодильник-морозильник BOSCH KGV 39XL20R и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 1 344 828 белорусских рублей |
| 2 | Екатерина Вераксо | |

**Победители по результатам второго розыгрыша от 26 апреля 2016 года:**

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Жуков Алексей Сергеевич | Холодильник-морозильник BOSCH KGV 39XL20R и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 1 344 828 белорусских рублей |
| 2 | Туманов Игорь Викторович | |

**Победители по результатам третьего розыгрыша от 11 мая 2016 года:**

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Мишенькин Владимир Николаевич | Холодильник-морозильник BOSCH KGV 39XL20R и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 1 344 828 белорусских рублей |
| 2 | Суздалев Михаил Анатольевич | |

**Победители по результатам четвертого розыгрыша от 24 мая 2016 года:**

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Дельянов Одиссей Рафаэльевич | Холодильник-морозильник BOSCH KGV 39XL20R и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 1 344 828 белорусских рублей |
| 2 | Купчинская Ольга Владимировна | |

**Сведения о наименовании и дате выхода печатного средства массовой информации, в котором опубликованы правила проведения Рекламной игры и сведения о результатах проведения Рекламной игры:**
Публикация правил Рекламной игры – газета «Звязда», № 55 от 25.03.2016 г. Публикация сведений о результатах проведения Рекламной игры – №109 от 10.06.2016 г. Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры: + 375 29 6 308 038.

УНП 690318126

**ОАО «ПИНСКИЙ КОМБИНАТ СТРОИТЕЛЬНОЙ ИНДУСТРИИ»**

**вносит изменение в извещение о проведении аукциона 12 июля 2016 г., опубликованное в газете № 107 от 08.06.2016 г.:**

**1. Объект – изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций» читать как:**

| | |
|---|---|
| Начальная цена (рублей) | 2 363 758 877 |
| Сумма задатка (рублей) | 236 375 888 |
| Начальная цена с учетом деноминации (рублей) | 236 375,89 |
| Сумма задатка с учетом деноминации (рублей) | 23 637,59 |

**2. Объект – изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций» читать как:**

| | |
|---|---|
| Начальная цена (рублей) | 2 679 673 050 |
| Сумма задатка (рублей) | 267 967 305 |
| Начальная цена с учетом деноминации (рублей) | 267 967,31 |
| Сумма задатка с учетом деноминации (рублей) | 26 796,73 |

**3. Объект – капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями) читать как:**

| | |
|---|---|
| Начальная цена (рублей) | 1 797 837 018 |
| Сумма задатка (рублей) | 179 783 702 |
| Начальная цена с учетом деноминации (рублей) | 179 783,7 |
| Сумма задатка с учетом деноминации (рублей) | 17 978,37 |

**Телефон для справок: 80165-37-16-07.**

УНП 200305504

**ООО «ИСТ ВЕСТ ИНЖИНИРИНГ»**

объявляет переговоры с процедурой снижения цены по выбору подрядчика по выполнению работ на объекте в г. Фаниполь «Внешнее электроснабжение производственной базы хранения, переработки и оптовой торговли химической продукцией (повышение надежности электроснабжения) Фанипольской базы ОАО «Белхим», г. Фаниполь, ул. Заводская, 25». Стартовая (проектная) стоимость предмета закупки: 2 758 152 000 белорусских рублей.

**Документацию для переговоров можно получить по адресу:** г.Минск, ул. Казинца, д. 11А, оф.506, тел./факс 8(017) 322-02-29. Вскрытие предложений состоится 15.06.2015 в 14.00.

УНП 191753078

**Утерянный представительством Белгосстраха по Советскому району г.Минска полис по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №1663292 считать недействительным.**

УНП 100122726



Міхаіл РАВУЦКІ:

TV@R

# «У КОЖНАГА БТшніка — СВАЁ БТ»

**Тэлегледачы, якіх цікавяць не толькі падзеі культурнага жыцця, а і асобы, дзякуючы якім яно фарміравалася ў розныя часы, і таямніцы беларускай гісторыі, знаёмыя з гэтым вядучым. Праграмы «Сіла веры», «Пра мастацтва», дакументальныя праекты «Слуцкія паясы», «Радзівілы. Тайны сям'і», «Шляхта. Брутальная гісторыя» і многія іншыя кожны раз збіраюць каля экранаў сапраўдных прыхільнікаў духоўнага і высокага. А сам іх аўтар кажа, што для таго, каб быць пачутым, трэба гаварыць, а не крычаць, і не варта баяцца прызнацца, быццам чагосьці не ведаеш, бо не ўсе таямніцы яшчэ адкрыты... У размове з загадчыкам аддзела навін культуры Міхаілам РАВУЦКІМ мы высвятлялі, чаму асабістыя інтарэсы не прыводзяць да поспеху, ці лёгкім быў шлях ад газеты да тэлеэкрана і якіх расследаванняў ад яго з камандай можна чакаць у перспектыве.**

**— У пачатку года вы ў чарговы раз атрымалі спецыяльную прэмію Прэзідэнта. Ці дае гэтая адзнака падставу для роздумаў пра сябе і сваю працу?**

— Так, двойчы ўжо адзначалі мяне. З разрывам у адзін сезон. І ўсё з манументальнымі гістарычнымі цыкламі-серыяламі. І такога яшчэ не было. Паверце, у якасці журналіста, які здымае, я не раз прысутнічаў на такіх цырымоніях. Асвятляў самыя першыя ўрачыстасці. Шчыра кажучы, пад іх не маглі знайсці нават адпаведнае памяшканне. Палац Рэспублікі лічыўся даўгабудам. Праводзілі ўсё ў яшчэ не адрамантаваным Вялікім тэатры. Памятаю, мы не маглі нармальна запісаць інтэрв'ю. З-пад адбіўкі чырвоных крэслаў вылазіла вата. Мармур і паркет былі пафарбаваны пад «паркет і мармур». Але куды важней былі эмоцыі тых людзей, якія на пачатку нашай незалежнасці, нягледзячы на нейкія фінансавыя цяжкасці, не зламаліся і працягвалі тварыць і здзяйсняць свае задумы. Нават на той глебе, якая яшчэ ўчора лічылася няўдзячнай і ў нечым рызыкоўнай. І дзяржава, і Прэзідэнт іх заўважылі, падтрымалі і заахвоцілі на новыя ініцыятывы. Тым самым падказваючы асобам і цэлым калектывам духоўныя прыярытэты, якімі будуць сілкавацца наступныя пакаленні. І вось з таго моманту ўжо сфарміравалася новае незалежнае пакаленне. А мы прадаўжальнікі і карыстальнікі духоўнага прадукту дзяржавы. Асабліва гэта адчуваеш, працуючы з камандай над гістарычнымі сагамі. Пэўна, і гледачы таксама, назіраючы, якія навальніцы білі нашы землі, яшчэ больш пачынаюць цаніць сённяшні час і дзень.

**— У сваёй працы лічыцеся з рэйтынгамі, якія фарміруюць прагляды гледачоў?**

— Мы ствараем няпростую публіцыстыку, за якую не бяруцца і не браліся да нас на іншых каналах. І гледачам трэба быць гатовым да спажывання такога прадукту. Таму з намі застаецца публіка, якая думае. І не трэба яе недаацэньваць. Інакш нам не заказвалі б падобныя серыялы, паверце... А калі наогул разважаць пра культурныя рэйтынгі на каналах... Мы разумеем, што трансляцыя оперы «Набука» з Вялікага тэатра наўрад ці збярэ такую ж тэлеаўдыторыю, як эстрадная «салянка». Але выдаткі на класіку ўсё адно куды большыя, чым на тую ж «папсу». Таму і аддача ад першага парадаксальна больш рэзанансная. Няхай не адразу. Можа, заўтра ці праз год... Нарэшце мы перасталі параўноўваць сябе з іншымі краінамі. Казаць, напрыклад, «другі Парыж» ці «другі Шаляпін». Мы ганарымся, што ў нас ёсць свая сучасная хваля мастацтва. І не комплексуем. Паверце, каб не рэнэсансныя крокі дзяржавы, пачатыя некалькі гадоў таму, пра нейкую сённяшнюю культуру казаць было б вельмі складана...

> **«Які ж сапраўды шок зведаў я нашмат пазней, калі даведаўся, што ў таго дзеда Куранца сапраўднае прозвішча — Куранцоў. І гэта мой прадзед, дзед маёй мамы!»**

**— Распачынаючы працу над новым дакументальным цыклам, як удаецца вытрымліваць раўнавагу паміж тым, што цікава асабіста вам, і тым, што можа «зачапіць» аўдыторыю?**

— Тэлебачанне пры ўсёй нашай персаніфікацыі і эгацэнтрычнасці прафесіі выпускае калектыўны прадукт. Бывае так, што чалавек выкажа думку, — і тут важна ўмець слухаць, каб і нам, журналістам-рэпарцёрам, і сцэнарыстам яе таленавіта і яскрава рэалізаваць. А сёння такі час, калі важная камандная творчасць, і перамагае той, хто змог згуртавацца. Так у любым праекце. Ты займаешся найперш журналістыкай і кіруешся не толькі асабістым інтарэсам. Я, дапусцім, умоўна люблю вышываць крыжыкам, аднак гэта не значыць, што пра вышыўку я павінен здымаць фільмы і сюжэты. І калі ў АТН, у прыватнасці ў аддзел культуры, просяцца на стажыроўку ці наогул працаўладкавацца выпускнікі, напрыклад, вакальных ці харэаграфічных аддзяленняў творчых ВНУ, то я адразу папярэджваю, што займацца культурай, любіць і захапляцца ёю — гэта адно, а расказваць пра яе — зусім іншае.

**— Калі працавалі над фільмам «БТшнікі», якія моманты са свайго жыцця на тэлебачанні прыгадвалі?**

— Я пра ўключэнне іх у фільм не думаў і не спадзяваўся. Такая персанальная стужка нікому не была б цікавая. З усёй аўтарскай камандай — а гэта амаль увесь аддзел навін культуры АНТ (нават хочацца сказаць – усё БТ, улічваючы яго 60-гадовы вопыт і архівы) — пастараліся абстрагавацца ад канала, медыяхолдынга, тавараў. І імкнуліся ўспрымаць БТ, яго мінулае, праграмы як старонку гісторыі ўсёй Беларусі. Абагульняць гэта вельмі рызыкоўна. Бо ў кожнага БТшніка — сваё БТ. І свая тэлегісторыя. Свае адносіны ў гледачоў. Мы хацелі зрабіць не проста карпаратыўны прадукт для ўнутранага прагляду, а найперш фільм для гледачоў. Каб яны не толькі акунуліся ў модны фармат «тэленастальжы», а сапраўды апынуліся па той бок экрана. І я скарыстаўся правам аўтара. Рэжысёр знайшоў мае «хібы эфіру» ўзору 90-х: калі я ў майцы і з доўгімі валасамі рабіў сюжэты для «Панарамы». Такім быў той час. І яго нельга выкрэсліваць. Мне важна было, каб гэта ўбачылі мае юныя калегі і падначаленыя. Каб яны адчувалі, што мы таксама вучыліся, і ў нас, як і ў іх, не ўсё было адразу дасканала. І гатовымі «зоркамі» на тэлебачанне ніхто не прыходзіць. Асобамі — так! Але важна яшчэ гэтую асобу заўважыць.

**— Кожны з вашых праектаў — добрая крыніца самаадукацыі для гледачоў. А што вам дапамагае як прафесіяналу і асобе?**

— Я не саромеюся казаць, што нечага не ведаю. Кожны фільм, кожны праект і сюжэт — гэта праца з чыстага аркуша. Уявіце, якія ў нас штодня педагогі-кансультанты-прафесура, дактары навук і акадэмікі. Здымаць тое, у чым ты добра разбіраешся, — гэта ісці па шляху найменшага супраціўлення. Лёгка займацца самаплагіятам. У нас напачатку быў дэтэктыў «Слуцкія паясы», пасля натуральна «Нацыянальная дылогія. Статут». Далей «Радзівілы. Тайны сям'і» і «Шляхта. Брутальная гісторыя»! Адно вынікае з другога. Прычым усё рабілася не дзеля глянцу і турыстаў, не ў форме спрошчанай аўтэнтыкі і фальклорнай лірыкі. Рабілі для тутэйшых, для саміх сябе. Бо часта нашу гісторыю мы вывучалі па чужых падручніках.

**— Яшчэ цікава, адкуль вытокі вашай любові да гісторыі і мастацтва? Сям'я на гэта неяк уплывала?**

— Мы ўсё ж больш папулярызатары. Застаёмся пры падзеях і побач з сапраўднымі дзеячамі і асобамі. Распавядаць пра мастацтва, як гэта робім мы, гэта ўсё ж зусім іншае, чым яго, мастацтва, ствараць. І першае здаецца куды прасцей за другое. Раскажу наступны выпадак... Калі я прыехаў з Цюмені, на журфак з першага разу не паступіў. Вярнуўся ў родны легендарны беларускі Быхаў. Ён ужо не быў рэжымны. Савецкі аэрадром быў расфарміраваны. Для мясцовых — што ўжо казаць пра мяне, цюменскага выпускніка — было сенсацыяй даведацца пра яго шматвяковую гісторыю, а не толькі тое, што тут хаваўся Керанскі і праязджала Кацярына. І калі я не паступіў, мяне, былога расійскага школьніка, узяла на працу мясцовая раёнка «Маяк Прыдняпроўя». Тады надта эканомілі на бензіне, і ўся рэдакцыя, а гэта выключна старажылы, грузіліся ў адну машыну і ехалі ў камандзіроўку, выгружаючы кожнага па маршруце руху, а падвечар усіх забіралі... Ведаеце, пэўна, у кожным мястэчку ці раёне ёсць ці была свая асоба, пра якую ходзяць легенды ці байкі... Дык вось, як толькі грамада пагрузіцца, усе мелі за гонар прыгадаць свае асабістыя сустрэчы і гісторыі з нейкім дзедам Куранцом з-пад Вараніно, мясцовым філосафам і майстрам на ўсе рукі. Да яго хадзілі па жыццёвыя парады... Больш за тое, дзед Куранец намаляваў пасля вайны ўсе абразы, што пад купалам Траецкай царквы Быхава. Помнік драўлянага дойлідства. Менавіта тут доўгі час захоўвалася святыня — Баркалабаўская ікона Божай маці. Для мяне ён, Куранец, стаў сапраўды культавай і міфічнай фігурай...

Які ж шок зведаў я нашмат пазней, калі даведаўся, што ў таго дзеда Куранца сапраўднае прозвішча — Куранцоў. І гэта мой прадзед, дзед маёй мамы! І ў яе такое дзявочае прозвішча. Потым высветлілася, што і стары Куранец па нейкіх прычынах не паспеў усё завяршыць, абразы дапісваў ужо мой юны дзед. Бацюшка за працу яму аддзячыў палотнамі і шыкоўнымі чырвонымі рамамі. Ён пакінуў некалькі самабытных манументальных пейзажаў і нацюрмортаў. Сённяшні настаяцель быхаўскага храма сказаў, што тыя пасляваенныя абразы счарнелі ад свечак, але ўсё адно маюць намоленую моц. На шчасце, я паспеў іх убачыць яшчэ пад купалам. Цяпер яны захоўваюцца ў скрутках у царкве. І я б надта хацеў паспрыяць іх рэстаўрацыі. Кожнай бы сям'і такую легенду... Ну і, дарэчы, таго Куранца звалі, як і мяне, Міхаіл.

> **«Нарэшце мы перасталі параўноўваць сябе з іншымі краінамі. Казаць, напрыклад, «другі Парыж» ці «другі Шаляпін».**

**— У адным з інтэрв'ю вы адзначалі, што варта чакаць працягу гістарычных расследаванняў. Якія тэмы і асобы выклікаюць сёння зацікаўленасць?**

— Я думаю, гэта не будзе выдаваннем карпаратыўнай тайны, бо шмат хто анансаваў наш праект. Натуральна, пра яго мы намякалі ў ранейшых гістарычных расследваннях... Але нельга казаць асобна пра легендарныя постаці ці каштоўнасці, не сістэматызаваўшы ўсе веды пра Рэнесанс на беларускіх землях. Толькі разгледзець яго хочацца ў першую чаргу з пазіцыі нашай спадчыны. Бо так атрымалася, што куды гучней пра сваю ролю заяўлялі сённяшнія нашы еўрапейскія суседзі, з кім мы знаходзіліся ў адным саюзе, а дзе ўвесь час былі беларусы?! Мы, аўтары, гэтым цікавімся як журналісты і папулярызатары. А дапамогуць нам шматлікія эксперты, гісторыкі і архівісты. Шкада толькі, што няма ніякіх фота- і відэасведчанняў! Галоўная праблема, калі даследуеш залаты век... У выніку шмат што стане зразумела і нам, і нашым суседзям.

**Алена ДРАПКО.**

**Поўную версію інтэрв'ю шукайце на партале zviazda.by**


## «НАМ З ВАМІ ПА ДАРОЗЕ»

**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**

**на III квартал або II паўгоддзе 2016 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце**
**ДА 13 ЛІПЕНЯ 2016 ГОДА**
**ў рэдакцыю на адрас:**
**вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.**




Сярод падпісчыкаў 14.07.2016 года будуць разыграны 7 двухмесных палатак Atemi і суперпрыз — веласіпед Stels Navigator 700 V 2016. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.07.2016 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.09.2016 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2016 года і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Нам з вамі па дарозе» чытайце ў нумары 103 газеты «Звязда» ад 02.06.2016 года.

**Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.**

**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 07.06.2016 ПА 30.09.2016 ГОДА.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2768 ад 26.05.2016 года, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2016 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________________________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________ на III кв. або 2–е паўг. 2016 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [          ] (індэкс) ________

______________________________________________

______________________________________________

Удачы ў розыгрышы!




# ЯК СМОЎЖ ПА АЛЬТАНЦЫ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Лу́ста** — адрэзаны вялікі плоскі кавалак. *«Маці памазала маслам лусту хлеба і падала сыну», — чытаем у Алеся Пальчэўскага.*

**Смо́ўж** — малюск, які мае ракавіну і вельмі марудна рухаецца. *Той самы слімак.*

**Альта́нка** — летняя паркавая або садовая пабудова для адпачынку. *Якуб Колас пісаў:*

*Не так даўно расце сядзіба,*
*А пагляддзі, што ёсць у ёй:*
*Садок, альтанка ў форме грыба,*
*Дзе ўтульнасць знойдзеш і спакой.*

**Кра́ты** — металічная загарадка на вокнах, дзвярах. Ад лацінскага crates.

**Сарамя́жны (разм.)** — збянтэжаны, нясмелы.

**Ма́рны** — дарэмны, бескарысны. Марныя намаганні.

**Ні складу ні ладу** — бесталкова, бязладна, без пэўнай логікі гаварыць, пісаць, рабіць. *Беларускія адпаведнікі: без толку, абы-як. Руская: ни склад ни в лад.*

**Грэць рукі** — нажывацца несумленным спосабам. *Беларусы яшчэ скажуць: грэбці пад сябе, набіваць кішэні. Руськія: набивать кошелек.*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

# Панядзелак, 13 чэрвеня

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Клуб рэдактараў.
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 13.05 Меладрама «Я не змагу цябе забыць».**



**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 16.35 Серыял «Сваты-4».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** Форум з Дзмітрыем Бачковым.
**21.00** Панарама.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Бельгія — Італія.
**0.30** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.15, 21.05** Тэлебарометр.
**9.10** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**10.55** Азбука смаку.
**11.25** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**11.55 Серыял «Класная школа».**
**13.55** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**14.55 Серыял «Косці».**
**17.55 Серыял «Вароніны».**
**19.15** Суперлато.
**20.05** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.

**21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**22.10** КЕНО.
**22.15** Рэпарцёр.
**23.10 Серыял «Быць чалавекам».**

## Беларусь 3

**8.00, 11.35, 18.05, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 21.50** «Час кіно».
**8.25 «Сапраўдныя здарэнні». Камедыя.**
**9.45** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**10.35** «Наперад у мінулае».
**11.00, 21.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.55** «Расія — душа мая». Людміле Зыкінай прысвячаецца. Канцэрт.
**13.25 «Сувязь». Меладрама.**
**14.45** «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Цікіны астравы».
**15.15 «Знак бяды». Драма.**
**17.40, 23.10** «Дыя@блог». Прамову.
**18.25** «Неразгаданая тайна». Навукова-папулярны фільм.
**19.05 «Паляванне на ліс». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**22.00 «Побач з вамі». Меладрама.**
**23.35** «Геапалітыка: свет за тыдзень».
***На тэлеканале «Беларусь 3» па Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях з 13 па 19 чэрвеня 2016 года на працягу адной гадзіны будуць трансляваца абласныя тэлепраграмы: панядзелак, аўторак, пятніца — з 18.05 па 19.50; серада — з 18.10 па 19.00; чацвер — з 18.10 па 19.20.***

## Беларусь 5

**7.15, 18.35** PRO спорт. Навіны.
**7.25** Плаванне. Міжнародны турнір (Барселона).
**9.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Германія — Украіна.
**11.10** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Польшча — Паўночная Ірландыя.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Бірмінгем.
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Агляд гульнявога дня.
**15.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Іспанія — Чэхія.
**17.55** Дак. фільм «Кацярына Вялікая».
**18.10** «Адзін дзень на шляху да Алімпа». Сінхроннае плаванне. Відэачасопіс.
**18.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Ірландыя — Швецыя.
**20.55** Баскетбол. Алімпійская кваліфікацыя. Жанчыны. Беларусь — Нігерыя.
**22.55** PRO спорт. Вынікі.
**23.20** «Жанчыны і спорт». Меліціна Станюта.
**23.55** Час футбола. Еўра-2016.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00, 11.10 Камедыя «Трыццаць тры».**
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.50, 13.10 Камедыя «Вяселле ў Малінаўцы».**
**13.40 Маст. фільм «Турэцкі гамбіт».**



**16.20** Канцэрт «Эххх, разгуляй!»
**18.20** «Адваротны адлік». «Фаня Аллер. Вайна без антракту». Фільм другі.
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15 Драма «Царства нябеснае».**
**0.40** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**15.55** «Часткі свету».
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тайны Чапман».
**23.50 Маст. фільм «Маладыя татулі».**

## МІР

**6.00** М/ф.
**8.25** М/ф «Прыгоды Аленкі і Яромы».
**10.00** Навіны.
**10.15 Маст. фільм «Госця з будучыні».**
**16.00** Навіны.
**16.20 Маст. фільм «Сэрцы трох».**
**21.10 Маст. фільм «Мільянер з трушчоб».**
**23.30 Маст. фільм «Махляры».**
**1.15 Маст. фільм «Хаціка: Самы верны сябар».**
**2.55** «Зроблена ў СССР».
**3.20 Маст. фільм «Яраслаў».**
**5.00** «Народы Расіі».

## РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Не адракаюцца,кахаючы...»**
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.00 Маст. фільм «Бацькі і дзяды».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.00, 20.00** Весткі.
**14.15, 17.00, 20.40, 23.10 Серыял «Сваты-3».**

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 8.20, 10.20, 16.20, 19.20 Серыял «Гульня».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**20.35 Серыял «Гульня. Рэванш».**
**23.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**

## 8 канал

**7.00, 14.25, 20.00, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.30, 20.05 Серыял «Вечнасць».**
**8.15 Трылер «Код доступу».**
**10.00 Серыял «Пад купалам».**
**10.45 Драма «Пунсовая літара».**
**13.05 Серыял «Каўчэг».**
**14.15, 18.20, 19.50, 21.00** «Хатняя крама».
**14.30 Серыял «Нашчадкі».**
**16.30, 19.40** «Кінаблакнот».
**16.45 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**18.30 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Свой фермер. Дзённік».
**21.20 Баявік «Містар і місіс Сміт».**
**23.10 Серыял «Бойся хадзячых мерцвякоў».**

# «ЧАС ФУТБОЛА»
## ў кампаніі з новай вядучай

**З 11 чэрвеня на тэлеканале «Беларусь 5» будзе выходзіць спецыяльны праект «Час футбола. Чэмпіянат Еўропы — 2016». Да бяззменнага вядучага і аўтара праграмы Мікалая Хадасевіча, акрамя запрошаных спецыялістаў і спартыўных каментатараў, далучыцца новая сувядучая — Аляксандра Наваева.**

З 10 чэрвеня па 10 ліпеня ў Францыі пройдзе кантынентальнае першынство па футболе. У канцы кожнага гульнявога дня, пачынаючы з 11 чэрвеня, будзе выходзіць спецыяльны выпуск «Час футбола. Чэмпіянат Еўропы — 2016» з аглядам усіх матчаў і каментарыямі экспертаў у студыі, не толькі айчынных, але і замежных. А ў якасці вядучых праграмы, якія будуць падтрымліваць кантакты з імі, мы ўбачым новую пару вядучых — Мікалая Хадасевіча і Аляксандру Наваеву. Дзяўчыне 27 гадоў, яна з'яўляецца заўзятай балельшчыцай маскоўскага «Спартака», хатнія і выязныя матчы якога рэгулярна наведвае. Аляксандра Наваева нават удзельнічала ў конкурсе прыгажосці, які арганізаваў клуб, і была прызнана «Міс Спартак — 2013».

Ужо вядома, што на час чэмпіянату ў адным з паркаў Мінска будзе арганізавана спецыяльная фан-зона, з якой будуць звязвацца вядучыя ў студыі, а таксама Аляксандра Наваева будзе кантактаваць з балельшчыкамі ў сацыяльных сетках у прамым эфіры праграмы. Такім чынам, у футбольных фанатаў з'явіцца магчымасць выказаць сваё меркаванне, задаць пытанне і нават выйграць выдатныя прызы. Напрыклад, дастаткова будзе даць правільны прагноз выніку матча наступнага дня — і можна атрымаць падарунак ад тэлеканала «Беларусь 5». Таму сачыце за «Часам футбола» і ўсімі матчамі «EURO-2016» у эфіры спартыўнага тэлеканала!

Алена ДРАПКО.

## ВТБ

**6.00, 10.00, 14.30, 22.50, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30, 13.45, 17.30, 23.30, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Пародро».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Кахае не кахае».
**9.30, 14.00** Серыял «Беглыя сваякі».
**10.30** «Кіно ў дэталях».
**11.30** Баявік «Нястрымныя 3».
**15.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.00** «Лаві момант».
**18.00** Серыял «Кахае не кахае».
**19.00** Серыял «Анжаліка».
**20.00** Серыял «Пушкін».
**21.10** Камедыя «М + Ж».
**0.00, 4.00** «Уральскія пельмені».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

## Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00** «Верце мне, людзі». Маст. фільм.
**11.55** «Энігма. Сэр Цім Сміт».
**12.40, 0.25** «Чаплін з Афрыкі». Дак. фільм.
**13.35** «Любо, братцы, любо...» Канцэрт Кубанскага казацкага хору. Маст. кіраўнік і галоўны дырыжор Віктар Захарчанка.
**14.35** Да 75-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Патапава. «Рэвізор». Спектакль Малога тэатра.
**17.50** Хібла Герзмава і сябры... Канцэрт у Вялікай зале Маскоўскай кансерваторыі.
**19.05** «Дарослыя дзеці». Маст. фільм.
**20.20** «Лінія жыцця». Людміла Хіцяева.
**21.10** «Паднятая цаліна». Маст. фільм.
**23.00** Каця і Марыэль Лабек, Сямён Бычкоў і Венскі філарманічны аркестр у канцэрце «Летнім вечарам у палацы Шонбрун».
**1.20** «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан». М/ф для дарослых.
**1.40** «Шукальнікі». «Нязгубленыя свет».
**2.25** П.І. Чайкоўскі. Скрыпічнае сола з балетаў «Спячая прыгажуня» і «Лебядзінае возера».

## Настальгія

**6.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2006 год.
**7.00, 8.40, 11.25, 12.40, 13.30, 14.45, 19.00, 21.40, 23.00, 1.05, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.15** «Зямля—Паветра». Алёна Свірыдава. 2003 год.
**9.00** «Быў час». 2009 год.
**10.00** Маст. фільм «Сыходзячы — сыходзь».
**12.00** «Акулы пяра». Канстанцін Кінчаў.
**13.00** «Рок-н-рол ТБ». Канцэрт гурта «Ліга блюза» ў тэатры Эстрады. 1992 год.
**13.50** «Усё будзе так, як мы хочам!» VI Ленінградскі рок-фестываль. 1989 год.
**15.00** Маст. фільм «Старэйшы сын».
**17.05** «Філасофія лёсу». Інтэрактыўная забаўляльная праграма.
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Свярдлоўскі рок». 2005 год.
**19.20** Маст. фільм «Маналог».
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1958. 1-я частка. 2010 год.
**1.25** Маст. фільм «Не баліць галава ў дзятла».
**4.00** «Колба часу».

## EuroSport 1

**5.30** Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
**7.00, 13.30, 17.00, 21.30** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана»-2015.
**8.00** Лёгкая атлетыка. Міжнародны Гран-пры.
**9.30, 12.20, 14.30, 0.15, 2.20** Футбол. «Фанаты Еўра».
**9.40, 12.30, 16.00, 20.00, 23.00, 1.15** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
**10.30** Тэніс. Турнір АТР. Фінал.
**11.30, 19.00, 0.25, 2.30** Лёгкая атлетыка. Міжнародны Гран-пры.
**14.40, 21.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**18.00, 0.00** Watts.
**18.30** «Лепшае з коннага спорту».
**19.55** «Дарога да золата».
**22.30, 1.50** Аўтаспорт. «24 хвіліны Ле-Мана».

## Камедыя

**0.25** Камедыя «Уцекачы».
**2.00** Камедыя «Шалёныя выкладчыкі».
**3.35** Меладрама «(Не)чаканы прынц».
**5.05** Меладрама «Двое — гэта занадта».
**7.05** Камедыя «Бамбу».
**8.45** Меладрама «Спытайце Сіндзі».
**10.35** Меладрама «Вельмі моцна закаханы».
**12.20** Меладрама «Даю год».
**14.10** Камедыя «Таткі без шкодных звычак».
**16.00** Меладрама «Закахацца ў нявесту брата».
**17.45** Камедыя «Вучань Дзюкабю».
**19.30** Камедыя «Татулі».
**21.10** Камедыя «Усё ўключана 2».
**22.55** Камедыя «Модная штучка».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.05** «Доктар І...»
**8.35, 18.50, 1.30** «Падарунак лёсу». Серыял.
**10.15, 3.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.05, 4.20** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**12.00** «У майго дзіцяці шостае пачуццё».
**12.55** «Без падману».
**13.45** «Мая безразважная сям'я». Камедыя.
**15.15** «Каменская». Серыял.
**16.10** «Жанчына ў бядзе». Серыял.
**17.05** «Правілы дарожнай непавагі». Дак. фільм.
**17.55** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**20.45, 0.45** «М.У.Р». Серыял.
**21.35** «Рэвізора».
**22.25** «Развітанне».
**23.10** «Звышнатуральнае». Серыял.
**23.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**2.20** «Нераскрытыя тайны».
**3.10** «Часова даступны».

## ТБ1000

**6.10, 18.10** Баявік «У праменях славы».
**8.10, 4.20** Меладрама «Жонка падарожніка ў часе».
**10.00, 2.00** Прыгоды «Каратэ-хлапчук».
**12.25** Камедыя «Аналізуй тое».
**14.10** Дэтэктыў «Перакладчыца».
**16.25** Камедыя «Як скрасці брыльянт».
**20.10** Драма «Народжаны чацвёртага ліпеня».
**22.40** Меладрама «А вось і Полі!»
**0.20** Фэнтэзі «Іншы свет: Паўстанне ліканаў».

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 16.10** Трагікамедыя «Апошні забой».
**8.20, 2.20** Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».
**10.40, 4.40** Камедыя «У стылі jazz».
**12.30** Старое добрае кіно. Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
**14.20** Камедыя «Вяселле па абмене».
**18.10** Драма «Мой зводны брат Франкенштэйн».
**20.20** Камедыя «Мужчына ў маёй галаве».
**22.30** Меладрама «Вораг нумар адзін».
**0.20** Баявік «Слізгаценне».

## National Geographic

**6.00, 7.35, 17.05, 18.40, 21.00, 0.55, 4.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 13.40** Гульні розуму.
**7.10, 13.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**8.20, 17.50** Падводныя тайны Галіпалі.
**9.10, 14.00, 19.30** Дзікае надвор'е.
**10.00, 14.45, 20.00** Спецвыпуск Nat Geo.
**10.45, 15.30** Інстынкт выжывання.
**11.35** Сапраўдны суперкар.
**12.20** Золата Юкана.
**16.20** Па слядах міфічных пачвараў.
**21.45, 1.40, 4.50** Сакрэтная зброя Японіі.
**22.35** Тайны гісторыі.
**23.20, 2.30** Уварванне на Зямлю.
**0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.

## Discovery

**8.00** Разбуральнікі легенд.
**9.00, 14.00, 19.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 19.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00, 0.00** Паляўнічыя на склады.
**11.00, 22.00** Дзікая кухня.
**12.00** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**13.00** Паездка ўлегцы.
**15.00, 7.10** Хуткія і гучныя.
**16.00, 5.30** Махінатары.
**18.00** Востраў.
**20.00, 3.50** Голыя і напалохання.
**21.00, 2.00** Выжыць разам.
**23.00** Залатая ліхаманка.
**0.30** Бітвы за кантэйнеры.
**1.00** Склады.
**1.30** Паляўнічыя на рэліквіі.
**2.55** Пешшу ўздоўж Ніла.
**4.40** Маланкавыя катастрофы.
**5.05** Сапраўдныя аферысты.
**6.20** Багажныя войны.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Гэты тыдзень больш за ўсё падыходзіць для адпачынку. У пачатку тыдня добра збірацца разам з сябрамі, ладзіць вечарыны і сумесныя паходы. Канец тыдня падыходзіць для больш спакойнага адпачынку. На працягу тыдня верагодныя значныя грашовыя паступленні, атрыманне заслужанага. Гэтак жа можа адбыцца тое, чаго вы доўга чакалі і да чаго імкнуліся. Надыходзіць час пажынаць плады сваёй дзейнасці, і калі вы сапраўды стараліся ўвесь гэты час, то і плады будуць адпаведнымі. Актыўныя дзеянні на гэтым тыдні не маюць сэнсу, трэба адпачываць і атрымліваць тое, што заслужылі.



**СКАРПІЁН.** Настаў час здрыгануцца і скінуць з сябе кайданы стомы, а заадно і перагледзець некаторыя планы на будучыню альбо свае адносіны да іх. У гэты час магчыма адраджэнне старых пачуццяў ці праява рамантычнага настрою, узмацняюцца творчыя парывы, асабліва ў кірунках, звязаных са зносінамі і навучаннем. Добры перыяд для завязвання новых кантактаў, а таксама абмену вопытам і ведамі. Вы можаце атрымаць каштоўныя парады адносна сваёй далейшай дзейнасці, а таксама і самі выступіць у ролі крыніцы мудрасці.



**СТРАЛЕЦ.** Пазітыўны настрой дазволіць вам глядзець без страху і сумневаў на любыя жыццёвыя сітуацыі і з лёгкасцю пераадольваць усе магчымыя перашкоды і рознагалоссі. У сярэдзіне тыдня могуць узнікнуць спробы вас падмануць, але гэта не нясе сур'ёзнай небяспекі для вас, зможаце лёгка выкрыць любыя змовы. Бліжэй да канца тыдня верагодны сустрэчы, новыя знаёмствы і прыемна праведзены час з блізкім вам чалавекам.



**КАЗЯРОГ.** У пачатку тыдня варта надаць сям'і і побыту, але не таму, што там з'явіцца праблемы, наадварот — сямейныя справы будуць ісці вельмі добра, і менавіта таму трэба рабіць на іх упор, бо потым вы будзеце занятыя іншымі справамі. Сярэдзіна тыдня — час, калі трэба прыслухоўвацца да сваёй інтуіцыі і кіравацца не імгненнымі жаданнямі або навеянымі з боку патрэбамі і мэтамі, а сваім сапраўдным прызваннем, якое можа адкрыцца вам у гэтыя дні.



**ВАДАЛЕЙ.** Тыдзень абяцае быць вельмі цікавым і багатым на падзеі, але гэта не значыць, што ён будзе просты і выключна спрыяльны. У пачатку тыдня прыслухоўвайцеся да хоўіх парадаў і рэкамендацый, нават калі яны разыходзяцца з вашым меркаваннем. Усё гэта спатрэбіцца ў другой палове тыдня, якая запатрабуе актыўных дзеянняў, самастойнага прыняцце рашэнняў і руху наперад. Вас чакаюць новыя адкрыцці, змены ў жыцці, але да чаго прывядзе гэты шлях, залежыць ад правільнасці вашых учынкаў і жадання штосьці рабіць дзеля сябе.



**РЫБЫ.** Будзьце вельмі ўважлівыя на пачатку тыдня, бо вялікая верагоднасць дробных, але прыкрых непрыемнасцяў, розных подласцяў з боку і гутарак за спіной. Будзьце ўважлівыя да выбару кампаніі, асабліва ў сярэдзіне тыдня — калі можа быць запланавана сустрэча або вечарынка. Адзін нядобразычлівец можа сапсаваць увесь настрой. Для распачынання новых спраў спрыяльны канец тыдня. Будзеце поўныя сіл і ідэй, але занадта імпульсіўныя, таму вам будзе проста неабходна знайсці прымяненне сваёй энергіі.

## Чацвер, 16 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.10 Меладрама «Залатая краіна».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Грачанка».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.00 Серыял «Жыць спачатку».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Германія — Польшча.
**0.50** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.20, 21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Трэцяя сусветная».
**11.25, 17.45 Серыял «Варонііны».**
**12.35, 18.55 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.30** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвэл-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны праект.
**16.15 Трылер «Закрытая школа».**
**17.15** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**20.55** Хачу ў тэлевізар!
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.30 Серыял «Быць чалавекам».**

### Беларусь 3

**8.00, 13.00, 18.10, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 17.15 «Смяротны танец». Серыял.**
**9.10, 19.10 «Немец». Серыял.**
**10.40** «Роднае слова». Першая беларуская граматыка Браніслава Тарашкевіча.
**11.05 «Трывогі першых птушак». Драма.**
**12.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці заслужанага дзеяча навукі БССР Фёдара Фёдарава.
**13.20 «Драма са старадаўняга жыцця». Меладрама.**
**14.40** «Сіла веры».
**15.10 «Эпілог». Драма.**
**16.35** «Кіно і час». Перабудова.
**18.30, 21.15** «Генералы». Шлях генерала. Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.55 «Сямейка Ады». Драма.**

### Беларусь 5

**7.40, 18.35, 23.00** PRO спорт. Навіны.
**7.50** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Крумкачы» (Мінск).
**9.40** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Францыя — Албанія.
**11.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Расія — Славакія.
**13.30** Тэніс. Турнір WTA. Бірмінгем.
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Агляд гульнявога дня.
**15.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Англія — Уэльс.
**18.00** Слэм-данк.
**18.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Украіна — Паўночная Ірландыя.
**20.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск).
**23.15** «На шляху да ЧС-2018». Відэачасопіс.
**23.55** Час футбола. Еўра-2016.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Практыка».**
**23.15** «На ноч гледзячы».
**0.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.35** «Вадзіць па-руску».
**16.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**0.30 «Водбліскі». Серыял.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Зроблена ў СССР».
**9.30 Маст. фільм «Вясёлая моладзь».**
**11.15, 0.50 Маст. фільм «Галубка».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны.
**13.15** «Цяжар абеду».
**13.45 Серыял «Хто памнажае смутак».**
**15.30, 2.35** «Справы сямейныя».
**16.20, 3.25** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.50, 3.50** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Дом узорнага ўтрымання».**
**19.20 Серыял «Станіца».**
**21.05 Маст. фільм «Прэзумпцыя віны».**
**22.55 Серыял «Кароткі курс шчаслівага жыцця».**
**23.55** Ток-шоу «Слова за слова».
**3.00** Дак. серыял «Іншы свет».
**4.15 Маст. фільм «У пошуках радасці».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «Юрый Андропаў. Тэра Інкогніта». «Пагрозы сучаснага свету. Электронныя грошы». «Пагрозы сучаснага свету. Смага планетарнага маштабу».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.50 Серыял «Каханне на мільён».**
**21.55, 23.10 Серыял «Фальшывая нота».**
**23.45 Маст. фільм «За чужыя грахі».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00** «Люстэрка для героя».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.20, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.50** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**14.20 Серыял «Ціхае паляванне».**
**15.10, 16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Гульня. Рэванш».**
**22.35** «Вынікі дня».
**23.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 20.05, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.30, 20.10 Серыял «Вечнасць».**
**8.15, 18.00 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**10.00 Серыял «Пад купалам».**
**10.40** «Свой фермер. Другі сезон».
**11.00 Драма «Помста».**
**13.00 Серыял «Каўчэг».**
**14.15, 17.00, 17.55, 21.00** «Хатняя крама».
**14.30 Серыял «Нашчадкі».**
**16.30** «Мой любімы гадавалец».
**17.10 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**19.50** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Меладрама «Маладая Вікторыя».**
**23.00 Серыял «Спартак. Багі арэны».**

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Лаві момант».
**6.30, 23.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Кахае не кахае».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Анжаліка».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Пушкін».
**11.30** Камедыя «Спачатку каханне, потым вяселле».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30, 23.30, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Камедыя «Прыгоды Філібера».
**0.00, 4.00** «Уральскія пельмені».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** Майстэрня Аляксандра Сакурава. «Яна чакае». «Лясы Вавілона». «Плынь». Маст. фільмы. «Перамога». Дак. фільм.
**12.10, 2.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**12.25, 20.30** «Правілы жыцця».
**12.55** «Расія, любоў мая!» «Адыгская кухня».
**13.25, 23.50** «Будэнброкі». Маст. фільм.
**15.10** «Паднятая цаліна». Маст. фільм.
**16.50** «Глеб Кацэльнікаў. Страпа жыцця». Дак. фільм.
**17.35** Дзмітрый Юраўскі і сімфанічны аркестр Масквы «Руская філармонія».
**18.30, 1.55** «Паліглот». Кітайская з нуля за 16 гадзін!
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Геніі і ліхадзеі. Мікалай Пуцілаў.
**21.00** «Варлам Шаламаў. Вопыт юнака». Дак. фільм.
**21.55** «Культурная рэвалюцыя».
**22.45** «Сяргей Урсуляк. Дзіўная памяць непражытага жыцця». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Такі прыгожы маленькі пляж». Маст. фільм.
**1.20** «Больш, чым каханне». Сяргей і Анастасія Курэхіны.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Бляск і галеча савецкага цырка». 2006 год.
**7.00, 8.45, 9.40, 11.00, 12.55, 14.20, 15.40, 18.50, 20.25, 21.40, 23.00, 1.00, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Тры таўстуны».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар: Павел Анатольевіч Аксёнаў. 2007 год.
**13.10** Маст. фільм «Артыст з Коханаўкі».
**14.35** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».
**17.00** «Філасофія лёсу». Інтэрактыўная забаўляльная праграма.
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». Групы «Николай Коперник» і «Начной проспект». 2006 год.
**19.05** Маст. фільм «Біч божы».
**20.45** Дак. фільм «Абмен».
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Свярдлоўскі рок». 2005 год.
**1.20** Маст. фільм «Маналог».

### EuroSport 1

**4.00, 7.00, 12.10** Лёгкая атлетыка.
**5.30, 9.40, 13.30, 17.30, 20.00, 22.00, 23.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана».
**6.30, 11.00** «Дарога да золата».
**8.30** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
**9.30, 12.00, 1.05, 2.20** Футбол. «Фанаты Еўра».
**11.30, 17.00, 22.30** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**12.00** Футбол. «Фанаты Еўра».
**14.45** Веласпорт. «Сачы за Фабіянам».
**15.00, 19.00, 1.15** Веласпорт. Рут-дзю-Сюд.
**2.30** Баявыя майстэрствы. Суперкомбат.

### Камедыя

**0.25** Камедыя «Багіня».
**2.20** Камедыя «Канікулы Дзюкабю».
**4.05** Камедыя «Вучань Дзюкабю».
**5.50** Камедыя «Бамбу».
**7.35** Камедыя «Палярны рэйс».
**9.15** Меладрама «Закахацца ў нявесту брата».
**11.00** Камедыя «Ну ты і прыдурак!»
**12.45** Серыял «Былыя».
**14.00, 14.50, 15.35, 17.30** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Цяжарны».
**17.50** Меладрама «Пастка для нявесты».
**19.30** Камедыя «Пераможцы і грэшнікі».
**21.30** Меладрама «Ажанюся на першай сустрэчнай».
**23.10** Меладрама «Сама па сабе».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.25** «Доктар І...»
**8.55, 18.50, 1.15** «Курт Сеіт і Аляксандра». Серыял.
**10.25, 3.25** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.15, 4.15** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**12.10** «Хатні рэстаран».
**13.05** «Шафа».
**13.50** «Тайныя знакі».
**14.45** «Каменская». Серыял.
**15.40, 5.05** «Здзелка».
**16.05** «Жанчына ў бядзе». Серыял.
**17.00, 21.25** «Рэвізора».
**17.55** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**20.30, 0.30** «М.У.Р». Серыял. Заключная серыя.
**22.20, 5.30** «Зоркі і містыка».
**22.55** «Звышнатуральнае». Серыял.
**23.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**2.40** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 18.20** Драма «Развітальны квартэт».
**8.10, 4.10** Меладрама «Маленькая чорная кніжка».
**10.20** Камедыя «Сцюарт Літл 2».
**12.10** Драма «Пробліск геніяльнасці».
**14.15** Драма «Джулі і Джулія: Гатуем шчасце па рэцэпце».
**16.20** Драма «Тэрэза Д.»
**20.10** Меладрама «Селеста і Джэсі назаўсёды».
**22.10** Трылер «Задыяк».
**0.45** Драма «Станцыя «Фрутвейл».
**2.20** Драма «Зорная карта».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Камедыя «Бясслаўныя прыдуркі».
**8.20, 2.30** Камедыя «Неваляшка».
**10.20, 4.30** Драма «Браты Ч.».
**12.20** Старое добрае кіно. Драма «Белая птушка з чорнай меткай».
**14.20** Баявік «Фарт».
**16.20** Трылер «Халодны фронт».



**20.20** Трагікамедыя «Зусім не простая гісторыя».
**22.20** Драма «Канец цудоўнай эпохі».
**0.20** Баявік «Антыкілер».

### National Geographic

**6.00, 18.40** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 13.40** Гульні розуму.
**7.10, 13.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.35, 16.20, 21.00, 0.55, 4.00** Каралі шахт.
**8.20, 17.50, 21.45, 1.40, 4.50** Дзікі тунец.
**9.10, 11.35, 14.00, 19.30** Сапраўдны суперкар.
**10.00, 14.45, 20.10** Аўта-SOS.
**10.45, 15.30** Інстынкт выжывання.
**12.20** Золата Юкана.
**22.35** Ракавая стыхія.
**23.20, 2.30** Уварванне на Зямлю.
**0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.

### Discovery

**8.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**9.00, 14.00, 19.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 19.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**11.00** Голыя і напалоханыя.
**12.00** Што у вас у гаражы?
**13.00** Глядзі ва ўсе вочы.
**15.00, 7.10** Браты Дызель.
**16.00, 5.30** Махінатары.
**18.00** Востраў.
**20.00, 23.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**21.00, 2.00** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**22.00, 2.55** Вулічныя гонкі.
**0.00** Паляўнічыя на склады.
**0.30** Бітвы за кантэйнеры.
**1.00** Склады.
**1.30** Паляўнічыя на рэлквіі.
**4.40** Маланкавыя катастрофы.
**5.05** Сапраўдныя аферысты.
**6.20** Прапажы на продаж.

## Субота, 18 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.55** Існасць.
**7.25 Меладрама «Усім тужлівым радасць». 1—2-я серыі.**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10 Серыял «Сваты-4».**
**10.15** «50 рэцэптаў першага».
**11.10** Дача.
**11.45** Нашы.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.00, 15.45, 0.05 Серыял «Мамачка мая». 1—2-я серыя.**
**15.15** Краіна.
**17.10 Меладрама «Лепшае лета нашага жыцця». 1—4-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Партугалія — Аўстрыя.
**23.55** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05, 21.05** Тэлебарометр.
**7.10 Серыял «Класная школа».**
**8.10 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**10.20** «Занадта шмат хвастоў».
**10.55** Азбука смаку.
**11.30 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**13.35** Вяселле без баяна.
**14.10** «Бітва экстрасэнсаў. XII».
**16.15** Капейка ў капейку.
**16.50** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**18.00 Камедыя «Пасля прачытання спаліць».**
**19.50** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**20.55** Хачу ў тэлевізар!
**21.10 Фантастыка «У пастцы часу».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.25** «Lady Блог». Модны праект.
**23.55 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**8.00, 13.55, 17.55, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 12.25** «Размаўляем пабеларуску». Тэлевіктарына.
